Тэлесеткі

# ХТО НАСТУПНЫ НА «ЕЎРАБАЧАННЕ»?

## У Беларусі пачаўся нацыянальны адбор на міжнародны дзіцячы конкурс

**Арганізуе і праводзіць адборачны этап Белтэлерадыёкампанія. Заяўкі ад юных артыстаў (ва ўзросце ад 9 да 14 гадоў на час правядзення конкурсу) альбо дзіцячага калектыву, у складзе якога да шасці чалавек, прымаюцца выключна ў электронным выглядзе — праз сайт www.tvr.by — да 15 жніўня.**

Патрабаванні да конкурсных песень засталіся ранейшыя: прымаюцца кампазіцыі на беларускай або рускай мове з уключэннем не больш як 40 % тэксту на замежнай мове, працягласцю да трох хвілін, а галоўнае — каб яны не былі публічна выкананыя альбо камерцыйна рэалізаваныя да 1 мая 2019 года.




Усіх удзельнікаў, чые заяўкі адпавядаюць правілам адбору, у тэрмін да 20 жніўня жыўцом праслухае прафесійнае журы — дарэчы, у палажэнні праекта асобна ўказана, што ніхто з суддзяў не можа быць звязаным альбо мець дачыненне да падрыхтоўкі канкурсантаў. Шанцы трапіць у спіс фіналістаў атрымаюць 7—10 найздольнейшых выступоўцаў, у якіх будзе час на шліфоўку сваіх кампазіцый і пастановак. Фінальны гала-канцэрт пройдзе ў верасні (не пазней за 27-е), а імя пераможцы нацыянальнага адбору абвесцяць у прамым эфіры па выніках галасавання гледачоў і прафесійнага журы.

Нагадаем, летась на дзіцячым «Еўрабачанні-2018», якое праходзіла ў Мінску, нашу краіну прадстаўляў Даніэль Ястрэмскі. Спявак заняў 11 месца сярод 20 канкурсантаў, а перамогу сваёй краіне ўпершыню прынесла Раксана Венгель з Польшчы.

Сёлетняе песеннае спаборніцтва пройдзе 24 лістапада ў Глівіцэ (Польшча) і збярэ, па звестках Еўрапейскага вяшчальнага саюза, 19 краін-удзельніц.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Найлепшыя барцы збяруцца ў Мінску

**З 26 да 28 ліпеня ў сталічным Палацы спорту пройдзе Міжнародны турнір па грэка-рымскай барацьбе памяці Алега Караваева.**



Плануецца, што ў спаборніцтвах возьме ўдзел больш за 230 спартсменаў з 20 краін: Беларусі, Бразіліі, Грузіі, Даніі, Ізраіля, Індыі, Казахстана, Кітая, Карэі, Латвіі, Літвы, Расіі, Турцыі, Узбекістана, Украіны, Фінляндыі, Чэхіі, Чылі, ЗША і Японіі.

Барацьба за медалі пойдзе ў 10 вагавых катэгорыях. Зборную Беларусі прадставіць 26 спартсменаў.

У ранейшыя гады турнір памяці Алега Караваева праходзіў у фармаце каманднага спаборніцтва, гэтым разам спаборніцтвы носяць статус кваліфікацыйных. Больш высокі рэйтынг атлета ў статыстыцы Міжнароднай федэрацыі барацьбы дае права выступіць без адбору на чэмпіянаце свету, які пройдзе ў верасні гэтага года ў Нур-Султане (Казахстан).

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Ну і ну!

# ПАЕШЦЕ ПЕРАД МАІМ ВЯСЕЛЛЕМ

## Нявесту абсмяялі ў сецiве за скрупулёзную інструкцыю для гасцей

**Карыстальнікі Facebook высмеялі інструкцыю для гасцей вяселля, якую напісала невядомая нявеста. На маштабныя ўказанні маладой звярнуў увагу таблоід The Sun.**



Ліст на дзвюх старонках, адрасаваны гасцям, пачынаецца з выбачэнняў нявесты за тое, што яна доўга не паведамляла нікому падрабязнасцяў мерапрыемства. Паводле яе слоў, яны з жаніхом не чакаюць, што ўсе госці змогуць наведаць імпрэзу. «Цырымонія будзе запісана на відэа ў Facebook для прагляду падчас урачыстасці або ў любы час пасля яе», — зазначыла яна. Жанчына запатрабавала, каб усе запрошаныя апавясцілі яе пра сваё рашэнне: у адваротным выпадку, запэўнівала яна, нечаканых гасцей папросяць пакінуць мерапрыемства. Далей нявеста патлумачыла, што будзе апранута ў сукенку «ружовага колеру з дэталямі з ружовага золата», молячы гасцей не апранацъ вопратку такіх колераў. Таксама яна падрабязна апісала пачастунак і папрасіла запрошаных прыйсці на вяселле сытымі. «Гэта невялікі прыём, так што ежы няшмат. Калі ласка, з'ешце што-небудзь перад прыездам», — заявіла яна.

Многія каментатары прыйшлі ў жах ад інструкцый нявесты і абсмяялі яе. Яны назвалі яе ліст «плыннно свядомасці» і ўдакладнілі, што дзяўчына падводзіць сябе неадэкватна. «Адчуваю, што я заслугоўваю запрашэння на вяселле, выдаткаваўшы столькі часу, каб прачытаць гэты ліст», — адзначыў адзін з іх.

Аднак некаторыя карыстальнікі заўважылі, што жанчына відавочна вельмі хвалюецца за сваё вяселле. «Небарака адчувае стрэс і належыць да такога тыпу людзей, які не хоча прыносіць нязручнасці ўсім», — расчуліліся яны.

**Іван КУПАРВАС.**



Сядзі і глядзі

# ПАЛЁТ ЧМЯЛЯ НАД ВОЛГАЙ

## 35 гадоў таму на экраны выйшаў «Жорсткі раманс»

**Двухсерыйную драму Эльдара Разанава цяпер называюць найлепшай экранізацыяй п'есы Аляксандра Астроўскага. Але спачатку выбар рэжысёра, вядомага сваімі камедыйнымі работамі, многіх здзівіў, а першыя рэцэнзіі наогул былі разгромныя. Затое ў 1985-м кінастужка «Жорсткі раманс» зрабіла фурор на міжнародным кінафестывалі ў Індыі, прадстаўляла СССР на фестывалі ў Таронта, стала «Фільмам года» паводле апытання часопіса «Савецкі экран» і прынесла Мікіту Міхалкову званне найлепшага акцёра года.**



...Гісторыю пра беспасажніцу Ларысу Агудалаву, якую многія кавалеры хацелі б мець у каханках, але ніхто не жадае ўзяць жонкай, і якая ад безвыходнасці прымае прапанову дробнага пыхлівага чыноўніка Карандышава, у Расіі пераносілі на экран двойчы, таксама паставілі аднайменны балет і оперу. Таму Разанаў загадзя ведаў, што ягоны — трэці па ліку — фільм будзе называцца інакш. З'яўляючыся вялікім прыхільнікам рамансаў, ён сам падбіраў іх для карціны — і знайшоў не ў старых рускіх песенніках, а ў вершах Ахмадулінай, Цвятаевай і нават у Рэдзьярда Кіплінга, чый пераклад «Цыганскай сцежкі» ператварыўся ў «Калматага чмяля». Яшчэ адзін верш — «Я, нібы матылёк, да агню...» — Эльдар Аляксандравіч напісаў сам.

Ён бачыў у галоўных мужчынскіх ролях выключна Мікіту Міхалкова і Андрэя Мягкова — і, толькі заручыўшыся іх згодай, «прабіў» дазвол у Дзяржкіно.

Здымкі ж праходзілі ў Кастраме. «Быў выбар — здымаць у Кастраме ці Суздалі, — згадваў рэжысёр у сваёй кнізе «Непадвезеныя вынікі», — але мне хацелася паказаць прыгажосць і прастору Волгі, перадаць настрой, які я помніў хлопчыкам. Я здымаў шляхецкую карціну, а ў Суздалі яна атрымалася б купецкая». Будынак



мясцовага тэатра лялек ператварыўся ў чыгуначны вакзал, дзе з помпай сустракаюць Паратава, а «Ластаўку» «сыграў» стары колавы параход «Спартак», прычым здымкі праходзілі і падчас звычайнага рэйса, для чаго пасажыраў угаварылі вызваліць частку палубы. І канешне, уражвае сама Волга — яе неабсяжныя прасторы, мяккія восеньскія пейзажы і сапраўдны густы туман, у якім здымалі фінал карціны.



Мікіта Міхалкоў настолькі ўжыўся ў ролю разгульнага пана і судаўладальніка Паратава, што насамрэч ладзіў для партнёраў па фільме рэгулярныя банкеты з тымі ж артыстамі-цыганамі, якія спявалі і танцавалі ў кадры. А адначасова, калі акцёрам затрымалі зарплату, кажуць, здабыў ліцэнзію, выправіўся на паляванне ў кастрамскія лясы і потым карміў здымачную групу мядзведжацінай.

А вось Андрэй Мягкоў на здымках ледзь не загінуў. Падчас эпізоду, дзе ягоны герой хоча вярнуць Ларысу і плыве на лодцы да «Ластаўкі», акцёр сядзеў спінай да парахода і не заўважыў, што лодка падышла надта блізка, — яна перакулілася, а ў варонку ад кола парахода зацягнула Мягкова... Здымачная група паспела толькі ахнуць. Нейкім цудам акцёр не толькі выплыў, але нават не атрымаў сур'ёзных траўмаў.

Што да Ларысы Гузеевай, то з дэбютанткай рэжысёр нямала памучыўся, каб ператварыць дзяўчыну-хіпі ў даверліва-безабаронную, рамантычную паненку. «Голасам» экраннай Ларысы — бо ў самой юнай актрысы была выразная арэнбургская гаворка — сталі Ганна Камянкова і Валянціна Панамарова, якой няпроста было перайсці ад цыганскіх песень і джазу на сур'ёзныя тэксты. Да таго ж яе імя не ўказалі ў цітрах, і артыстка на доўгі час пакрыўдзілася на рэжысёра — пры гэтым рамансы ў яе выкананні вокамгненна сталі папулярныя і выйшлі асобнай пласцінкай.

**Сказана!**

*«Ва ўсякага свой густ: адзін любіць кавун, а другі — свіны храсток».*

*«Што ж вы маўчалі, што ў вас каньяк ёсць? Столькі часу змарнавана!»*

*«Хіба можна ў наш час камусьці давяраць? Распрануць тут жа!»*

*«Ёсць межы, за якія асуджэнне не пераходзіць».*

*«Дык не даставайся ж ты нікому!»*